**Цэна асобнаго нумэру 5 кап**

Год V. Вільня 11 Лістапада (Ноября) 1910 г. № 46.

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА З РЫСУНКАМІ

**Выходзіць што тыдзень рускімі і лацінскімі літэрамі.**

Адрэс рэдакціі і адміністрації: **Вільня, Віленская вуліца, д. № 20.**

Цэна з перэсылкай і дастаўкай да хаты: на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес. — 1 р. 25 к., на 3 м.—65 к., на 1 мес. — 25 к. За граніцай: на 1 г. — 4 р., на 6 мес. —2 р., 3 мес. —1 р. Перэмена адрэсу — 20 кап.

**Хто не здалее адзін плаціць за „Нашу Ніву“, хай знойдзе еш-чэ колькі людзей і выпішэ газэту хаўрусам.**
**Хто спагадае справе адраджэньня нашаго народу, нехай падтрымае нашу працу і падпішыцца на „Нашу Ніву“.**

## Лев Мікалаевіч Толстой.

**Памёр 7 лістапада (ноября) а 6 гадз. 5 мінут раніцы на ст. Астапово.**

83 гады жыў, і больш як поўсталецьце працаваў на карысць усяго чэлавецтва. Л. Н. Толстой углядаўся у душу, у долю рускаго-мужыка, і у тым жыцці мужыцкім ён знайходзіў усё багацтво думак сучасных. Словам простым зразумелым развязываў найбольшіе загадкі жыцьца. Яго слово—гэто быў звон-набат—і голас гэты разходзіўся па ўсяму сьвету. Німа хіба на сьвеці газэты каторая-бы не пісала аб гэтым вялікім вучыцелю, сеўцу згоды і любві паміж людзьмі. Ён заваёвываў ворагоў сваім нештодзенным, сьмелым, |справедлівым выступленьнем. Калі дзе здзекаваліся,

крыўдзілі чэлавека, там ў абароне скрыўджэных заўсёды ставаў дзед з Яснай Паляны. І гаварыў горда, сьмела. Што можна было казаць Толстому, таго ня можна іншым. Ён умеў змусіць усіх шанаваць сябе і сваю асобу зрабіць нетыкальнай. Каб з ім памерацца трэба было быць веліканам мысьлі і духа, трэба мець грудзі каторые не задрыжаць страхам і мець дух свабодны серод нявольных!

Толстога знали ўсе, увесь сьвет чытаў яго апаведаньня, яго вялікие мысьлі. Такіе мысьлі і словы, што новые дарогі паказываюць, і доляй народоў кіруюць. Німа у Расеі яму роўнага па заслугах і німа пісьменніка каб яго стольки кніжок было выдано. Імя графа-мужыка Толстога грымела па усяму сьвету. Стыдаўся, што ён граф—і нямог у гэтай парожняй грамадзе жыць. Сьветам яго была Ясная Паляна, таварышамі яго былі мужыкі-хлебаробы. Разам з імі на поле выходзіў, памагаў ім ак добры сусед, будуючы ўласнымі рукамі хаты, коміны і печы. Казаў што шчасце у счасці грамады—трэба любіць бліжняго і памагаць. Так рабіў мудрэц і граф радавіты і на гэто весь сьвет спаглядаў. Толстой закладаў школы учыў дзяцей і як сам кажэ: „ад дзіцяці і мужыка сам вучыўся“. Аб мужыку кажэ: «што ён мае добрую і справедлівую душу, і трэба аткликнуцца калі ён завець!» Душой, сэрцэм і мысьлей зжываецца з доляй мужыка.

Толстой быў сумленьнем цэлаго сьвету. Калі сільные здзекаваліся над слабымі усе чэкалі голасу Толстого, і не обмылялілся, ён казаў і голас яго грымеў па ўсім сьвеце, як голас прарока. Лягчэй было жыць, нават у самые трудные мінуты, калі мы ведалі, што жыве друг людзкі, мудрэц ясно-полянскі. Бо ён заўсёды думаў за мільёны людзей—нават у астатнюю мінуту, калі ужо канаў, Толстой звертаецца да тых, што окружалі яго з тым; „што ён адзін, а там мільёны людзей.“—Уміраючы думае не аб сабе, а аб грамадах людзкіх.

Ніколі не хацелося верыць, што яму 82 гады—бо ў думках сваіх ён быў бодрым і маладым, ён наймалодшым быў блізкім.—Прыгледзьцеся, што дзеецца, як сьмертэльная хвароба прыкула Толстого да ложка, с каторага не суджэно было яму устаць. У Бэрліне, Лондоне, Пецербурзе, Варшаві, Вільні і т. д. ходзяць людзі спатыкаюць адзін аднаго пытаюць; а што? як Толстой? Тэлеграмы, што колькі гадзін прыходзяць з места, дзе ляжыць хворы, газэты, аб яго здароўі рвуць з рук. Разам падае звестка: „Толстого не стало—памёр і чэлавека німа.—Стаіш як прыбіты і ня верыш. І ня хочэцца верыць што голас Толстога не адзавецца ужо, што горда і сьмела не аддасцца па усей зямлі!

Дэп. *Годнев* (акцябрыст, ад гор. Казані) кажэ аб аздараўленьні Пецербурга, што провінція—сёлы і гарады—жыве ў ешчэ больш нездаровых варунках. У Пецербурзе памірае па 100 тысяч душ жыцелёў 185 чэлавек, у Орэнбурскай губ. 1225 чэл., у Чэрнігоўскай—958 ч., у Самарскай—942 ч.

* * *

*Заседаньне 37.* Партія народнай свабоды просіць зрабіць запрос аб гісторыях у Одэсскім унівэрсытэце (глядзі № 51 „Н. Н.“). Дума прыняла запрос.

# Лев Толстой у памяці мужыкоў беларусоў.

Як ведама ўвесь культурны сьвет падаў на калені перэд магілай вялікаго вучыцеля зямлі Расейскай, перэд барцом за праўду і шчасьце на зямлі, якім быў Лев Толстой

Многа для каго яго навука сталася зоркай праводнай у жыцьці. Усе культурные людзі, хто чым і як можэ, умацовываюць яго памяць у народзі. А як атклікнуліся на сьмерць Толстого мужыкі, гэты цёмны і забіты, але вялікі і магучы сьвет? Як спаткаў гэты сьвет сьмерць таго, хто аб ім гаварыў усё жыцьцё, хто яму аддаваў усе свае сілы і аб ім думаў перэд самай сьмерцьцю, кажучы да ўсіх тых, хто быў пры ім: „Вы ўсё каля мяне, а таго ня помніце, што *там*—мільёны“,.. Ды ці знаў же мужык глухой вёскі што-нібудзь аб ім? О, гэта запытаньне лішняе! Хоць не чытаючы яго твороў, нават ні бачучы іх, але нейкім пачуцьцем, па цёмных чутках, усюды—у самых глухіх кутках аграмаднай Расеі —імя Толстога вядома і выгаварываецца з вялікай пашанай. З газэт мы чулі, што мужыкі нясьлі яго дамавіну і вянок свой убогі паперадзі ўсіх; нават іншые з далёк прыежджалі на яго магілу. пасылалі з вёсак спагадлівые тэлеграмы. Але большая частка мужыкоў ня ведае ешчэ, што памёр той, аб кім не раз дзівы даводзілося чуць. Ім газэта нічога ні скажэ: для іх Толстой так як-бы не радзіўся, не ўміраў і не памёр. Яны—гэтые цёмные мільёны—пазналі яго с казак і, колькі маглі абезсьмерцілі яго Чуткая душа мужыка сплела с казак квяцісты, дзіўны, незвядаючы вянок на галаву вялікаго ваякі за праўду. Усё жыцьцё „добраго Толстога“ адбіваецца ў гэтым вянку, як у люстры, хаця ў розных мейсцах ён розны..

Я хачу падзяліцца адным такім малюнкам Толстога, які злажылі мужыкі беларусы майго павету (Слуцкаго). Гэта—сьветлы, ясны памятнік, і вос як змалевала яго думка нашаго селяніна.

„Было гэта так. Калі распусьцілі першую Гас. Думу і сабралі другую, колькі дэпутатоў, выбраных у другую Думу, паехалі к Толстому у госьці. Ён іх прыняў шчыра, пасадзіў за стол і пачаў частаваць . Яды было ўселякай многа і ўсе пілі і елі, весяліліся. Раптам Толстой устаў з-за стала і пайшоў і прынёс дзьве

міскі: адну—с перцам, другую—з макам, ды сказаў, каб новые дэпутаты пакаштавалі таго і другога. Дэпутаты папробавалі маку, а пасьля і перцу. Ад перцу у ўсіх пацяклі сьлёзы і ўсе пачалі плеваццa.. Гледзючы на гэта, Толстой весела разсьмеяўся і сказаў: „Вось, бачыце, як горка і праціўна. А мак смачны, нябось? —Так і жыцьцё мужыкоў—горкае, як перэц, а вашэ і другіх паноў—салодкае, як мак... Дык трэба, мае паночкі, як засядзеце у Думе, старацца за мужыкоў, каб іх жыцьцё зраўняць з макам“.

„Дэпутаты маўчалі і думалі... Потым паехалі у Думу і пачалі бараніць мужыкоў. Яны так баранілі іх, так баранілі, што Думу распусьцілі“...

Так расказываюць сабе нашы мужыкі аб Толстым, а побоч гэтай казкі легенды ідуць многіе другіе. Ціж гэто не найдаражэйшы памятнік—вянок на магілу вялікаго ваякі за праўду? Ці не перэжыве ён другіх памятнікоў—с каменя і гліны? Не, што творыць народ, за гэта німа мацнейшаго!

Так беларускіе мужыкі абезсьмерцілі памяць вялікаго расейскаго пісьменніка.

**Цішка Гартны.**

# Сэрца спытай...

Прыгледзься днём яснаму сонцу
І месяцу ночнай парой;
Ў шум цёмнай услухайся пушчы
І ў шумы паводкі вясной;

Кінь вокам на мур пабеляны,
На стрэхі з саломы зірні;
Зайдзі на магілкі с крыжамі
І насып забыты крані;

Пакратай мінуўшчыны попел,
Што ў казках ня кінула жыць;
Сягоняшні дзень паймі добра,
Што ў сьлед нашай долі бяжыць...

І ўсюды—ад краю да краю,
Дзе зьвернецца думка твая,—
Аб роднай старонцы пытайся
Ты неба, зямлі і жыцьця,—

А сэрцэ—калі ня звёў сэрца—
Аткажэ за ўсіх не ў нарай:
У нас ёсць паны і іх слугі,
А людзі...што-ж?..Сэрца спытай...

**Янка Купала.**

*Пецербург.*

# Доктарская помач у Гродзенскай губэрні.

Ведама, што ў Расейскім гасударстві на кожную тысячу радзіўшыхся дзяцей памірае ў першым гаду жыцьця 273, а тымчасам у Франціі—толькі 166, у Норвэгіі—104, у Ірландіі (што пад